КРЫНІЦАЗНАЎСТВА

*Ганарыцца славаю сваіх продкаў не толькі можна,*
*але і патрэбна; не паважаць яе ёсць ганебная маладушнасць.*
*А.С.Пушкін*

**Анастасія ГУЛАК**



П.А.Бяссонаў у 1890-я гг.

# Ідэі заходнерусізму ў "Гісторыі беларускага краю" Пятра Бяссонава



*ГУЛАК Анастасія Анатольеўна нарадзілася ў г. Пінску Брэсцкай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт БДУ ў 1989 г. Працавала настаўніцай. Скончыла аспірантуру ІМЭФ НАН Беларусі ў 1998 г. Цяпер старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры на кафедры этналогіі і фальклору. Займаецца праблемамі гісторыі беларускай фалькларыстыкі.*

Імя Пятра Аляксеевіча Бяссонава (1828—1898), даследчыка беларускага і рускага фальклору, этнолага і публіцыста, аўтара знакамітага зборніка «Белорусскіе песни съ подробнымъ объясненіемъ ихъ творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта» (1871), належыць да шэрага імёнаў заснавальнікаў беларускага нарадазнаўства. Практычна невядомымі навуковай грамадскасці застаюцца дзве яго буйныя працы па гісторыі Беларусі, напісаныя ў пачатку 1870-х гг.: «Сепаратизмъ въ Северо-Западномъ крае. Рассказъ очевидца» і «Исторія белорусскаго края, ея потребность и возможность» (далей «Гісторыя беларускага краю»). Іх рукапісы захоўваюцца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, а мікрафільмы ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Выхаванне ў сям'і маскоўскага праваслаўнага святара, адукацыя, атрыманая ў духоўнай семінарыі, абумовілі рэлігійныя погляды П.Бяссонава, якія сталі асновай яго ідэйных перакананняў. Фарміраванне навуковых і грамадскіх поглядаў адбылося пад уплывам творчасці дзеячаў славянафільскага кірунку другой паловы XIX ст. П.Кірэеўскага, К.Аксакава, А.Хамякова, Ю.Самарына.

У сваіх навуковых і публіцыстычных творах П.Бяссонаў аддаваў прыярытэт тым навуковым праблемам, вывучэння якіх вымагала славянафільская тэорыя: гісторыя праваслаўнай царквы, палеаграфія, славянскія мовы і фальклор. Ва ўсіх яго працах у той ці іншай ступені ўвасобіліся дамінантныя ідэі славянафільскага вучэння: месіянства рускага народа і яго кансалідуючая роля ў славянскім свеце, ідэалізацыя патрыярхальнай славянскай мінуўшчыны і рускага праваслаўя. Паводле азначэння гісторыка рускай публіцыстыкі А. Дзяменцьева, славянафільства ўяўляла сабой «асаблівую рускую разнавіднасць рэакцыйна-нацыяналістычнага рамантызму», блізкага да «афіцыйнай народнасці»[1].

У 1864—1867 гг. П.Бяссонаў узначальваў Віленскую археаграфічную камісію. У яго гісторыка-публіцыстычных нарысах утрымліваюцца цікавыя звесткі пра сацыяльна-палітычную сітуацыю ў гэтым краі пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. Роздум даследчыка аб правільнасці русіфікатарскай палітыкі, якая здзяйснялася пад кіраўніцтвам М. Мураўёва і яго паплечнікаў, шчырае імкненне асэнсаваць гістарычныя шляхі беларускага народа вызначаюць ідэйна-тэматычны змест публіцыстыкі П.Бяссонава. Аўтар не раз указваў на менавіта сацыяльна-палітычную матывацыю сваіх даследаванняў. Вывучэнне гістарычных і этнічных каранёў беларускага народа павінна было, на думку П.Бяссонава, не толькі запоўніць прабелы ў даследаваннях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Будынак публічнай бібліятэкі і музея ў Вільні, дзе ў шэрагу ўстаноў у 1865—1866 гг. працаваў П.Бяссонаў.*
З кнігі «Виленский музей древностей» (1892).

*Фрагмент рукапісу працы П.Бяссонава «Исторія белорусскаго края, ея потребность и возможность».*



Исторія Бѣлорусскаго края, ея потребность и возможность.

I.

Когда еще не было прямаго, открытаго возстанія Поляковъ, когда въ Польшѣ и нашемъ Юго-Западномъ краѣ, также въ Малой-Бѣлой Руси начиналось только броженіе разнородныхъ вопросовъ, требовавшихъ отвѣта, и волненіе умовъ, сопровождавшееся взрывами, мы, чувствовавшіе въ близости катастрофы и хорошо распознавая историческія ея признаки полагали, что наступила пора, когда Русская наука

тагачасных расійскіх навукоўцаў па беларускай праблематыцы, але і вырашыць такія сацыяльна-палітычныя праблемы Паўночна-Заходняга краю, як уціхамірванне сепаратысцкіх настрояў, усталяванне рускай навукі, культуры і адукацыі, умацаванне праваслаўя. Таму аўтара "Гісторыі беларускага краю" можна аднесці, паводле думкі выдатнага беларускага навукоўца А.Цвікевіча, да прыхільнікаў ліберальна-памяркоўнага заходнерусізму[2].

Заходнерусізм як кірунак грамадскай думкі вызначаўся негатыўным стаўленнем да магчымасці палітычнага і культурнага самавызначэння Беларусі. Гістарычныя перадумовы яго ўзнікнення звязаны з інкарпарацыяй Беларусі ў склад Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай і неабходнасцю абгрунтавання палітыкі русіфікацыі. Ліберальна-памяркоўныя прыхільнікі заходнерусізму прызнавалі пэўную гісторыка-культурную і этнічную адметнасць Беларусі, пры тым усё мінулае беларускага краю разглядалася з вялікадзяржаўных пазіцый.

П.Бяссонаў як прадстаўнік ліберальна-памяркоўнага кірунку заходнерусізму прызнаваў існаванне гістарычна сфарміраванай сацыякультурнай цэласнасці пад назвай «Беларусь». Беларусаў ён вызначаў як асобны народ славянскай супольнасці, які гістарычна і культурна належыць усходнеславянскаму рэгіёну — традыцыйнай зоне візантыйскага ўплыву. Аднак з бясспрэчнага ў навуковым сэнсе сцвярджэння, што менавіта хрысціянства ўсходняга абраду першым усталявалася на тэрыторыі Беларусі, аўтар прыходзіў да памылковага атаясамлення этнічнага і канфесіянальнага фактараў: беларускасці і праваслаўя — аднаго з асноўных пастулатаў заходнерусізму.

У аснове гістарычнага развіцця Беларусі, на думку П.Бяссонава, была пастаянная барацьба паміж Усходам і Захадам. Усходні ўплыў атаясамляўся ім з «рускім пачаткам» і праваслаўем, а заходні — з «польскасцю» і каталіцызмам. Сутыкненне розных традыцый адбівалася на развіцці беларускага этнасу і адлюстроўвалася ў міжканфесіянальных ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

носінах, садзейнічала зmяненнем форм дзяржаўнага ўладкавання беларускіх зямель: адносна самастойнага (Полацкае княства, Вялікае княства Літоўскае) або як часткі сістэмнага цэлага (Рэч Паспалітая, Расійская імперыя). Пераемнасць, як слушна лічыў аўтар, захоўвалася толькі на ўзроўні традыцыйнай народнай культуры.

Пры памылковасці і неабгрунтаванасці некаторых зыходных тэарэтычных пазіцый П.Бяссонаў выказаў шэраг меркаванняў, якія мелі станоўчае значэнне для далейшага развіцця тагачаснай гістарычнай навукі. Напрыклад, прычынай таго, што Беларусь не здолела абараніць сваю дзяржаўнасць і была цалкам паглынута «дзяржавай чужога кораня», П.Бяссонаў называе Люблінскую унію 1569 г., а «Залатым векам Беларусі» лічыць XVII ст. У «Гісторыі беларускага краю» ён акрэслівае рысы позняга Адраджэння з яго рэфармацыйна-гуманістычным духам і ўплывам на развіццё культуры беларускіх зямель XVII—XVIII ст. П.Бяссонаў піша пра развіццё тут летапісання, юрыдычна-дзелавой пісьменнасці на старабеларускай мове, адукацыі, выдавецкай справы, тэатральнага і музычнага мастацтва.

П.Бяссонаў ідэалізаваў Старажытную Русь, лічыў яе гарманічным і справядлівым грамадствам, у якім абшчынны лад жыцця і працы меў дэмакратычны характар, а былінны эпас увасабляў слаўную мінуўшчыну. У прыватнасці, ён сцвярджаў, што праваслаўнае духавенства Старажытнай Русі, па сутнасці, не складала самастойнага саслоўя. Прынямцце духоўнага сану «дазвалялася асобам усіх саслоўяў, якія здолелі дасягнуць духоўнага развіцця і вышэйшай адукаванасці»[3]. А падзелу духавенства, развіццю саслоўнасці ў ім, згодна П.Бяссонаву, садзейнічаў уплыў з Захаду.

Такія сцвярджэнні аўтара цалкам адпавядаюць славянафільскай тэорыі, але пярэчаць гістарычнай праўдзе. У Старажытнай Русі, як і ў Візантыі, праваслаўнае духавенства з самага пачатку з'яўлялася саслоўем прывілеяваным і падзялялася на чорнае і белае. Чорнае духавенства мела высокі статус у грамадстве і вялікае значэнне ў дзяржаўным жыцці. Яно займала кіруючыя пасады ў царкоўнай іерархіі (мітрапаліта, архіепіскапа, епіскапа). Становішча белага духавенства было іншым. Яно не вызвалялася ад плацяжоў і павіннасцей на карысць дзяржавы, папаўнялася з дзяцей святароў, мяшчан, небагатых купцоў і нават сялян.

У старажытнасці, пісаў П.Бяссонаў, «пытанні веры» вырашаліся ці жыццёвай практыкай, ці саборнай радай. А ў XVII ст. «яны пераходзяць у справы кабінета і навукі, вырашаюцца вучонымі галавамі, пісьмовымі разважаннямі, літаратурай, іх вырашае духавенства, як саслоўе, з перавагай вучонасці»[4]. Пасля рэформы патрыярха Нікана, — піша П.Бяссонаў, «праваслаўе далёка адхілілася ад грэчаскага ўзору, у многім адрывалася ад старых паданняў Рускіх, у многім сыходзілася з варожым Каталіцтвам»[5].

З патрыярхаў, якія асабліва вызначыліся ў барацьбе за чысціню веры, П.Бяссонаў адзначае Філарэта (1619—1633) і Іосіфа (1642—1652). «Яны выстаўлялі ўсю зброю Рускага і Агульна-Усходняга праваслаўя супраць пагрозы Лацінства, асыпаючы яго за мінулае і на будучае грознымі праклёнамі, яны прадчувалі маральную і грамадскую бяду, якую мы зведаем пасля замірэння з Польшчай»[6].

П.Бяссонаў імкнецца да рознабаковага агляду гістарычных з'яў, аднак у яго ацэнках падзей і ў іх храналогіі ёсць недакладнасці. Нельга пагадзіцца з аўтарам, што «праваслаўе, якое зазнала заходні каталіцкі ўплыў, непарыўна звязалася з рэформай Пятра І і ўмацавалася да такой ступені, што ні купка Велікаросаў, ні Грэкі кшталту Ліхудаў не здолелі гэтаму супрацьстаяць...»[7]. «Купкай Велікаросаў» аўтар называе праваслаўных святароў пры двары Аляксея Міхайлавіча, ранейшых паплечнікаў Нікана па гуртку «багалюбцаў»: духоўніка цара, пратапопа Стэфана Ваніфацьева, пратапопа Іаана Няронава і легендарнага пратапопа Авакума.

У сваіх разважаннях пра гісторыю расійскага праваслаўя П.Бяссонаў згадвае палемічную літаратуру Беларусі і Украіны канца XVI—першай паловы XVII ст. Даследчык зазначае: «палемічная багаслоўская літаратура, якая ўпершыню ў нас з'явілася, тычылася перш за ўсё каталіцкага ўплыву, мела характар лагічнай тэалогіі ў апалячаным, ці уніяцкім, ці абруселым Паўднёва-Заходнім адзенні»[8].

П.Бяссонаў узгадвае палемістаў, якія ўзнімалі вострыя пытанні царкоўнай дагматыкі, сацыяльна-палітычнага жыцця. З праваслаўных дзеячаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай ён называе архіепіскапа Чарнігаўскага і Ноўгарад-Северскага Лазара Барановіча, які паходзіў з беларускай шляхты Магілёўшчыны. Л.Барановіч на працягу 20 гадоў узначальваў кафедру кіеўскіх мітрапалітаў і паказаў сябе як добры дыпламат у дачыненнях з Масквой і канстанцінопальскім патрыярхам. У 1670-я гг. архіепіскап Лазар заснаваў Чарнігаўскую друкарню, знакамітую сваімі багаслоўска-літаратурнымі выданнямі. На думку П.Бяссонава, вялікае значэнне ў заходнерускай палемічнай літаратуры меў зборнік Л.Барановіча «Жыція святых» (Чарнігаў, 1670).

«З Паўднёвага Захаду, з Польскай мяжы, — адзначае П.Бяссонаў, — пачатак усіх сучасных школ і рэфармаванай літаратуры, адтуль містэрыі — пачатак тэатра, адтуль канты і канцэрты і напевы — пачатак нашай капэлы»[9]. Менавіта Лазар Барановіч спрычыніўся да збірання і пашырэння гарманічных царкоўных спеваў лінейнай сістэмы, спеваў, якімі славіліся беларуска-ўкраінскія землі ў праваслаўным свеце[10].

Пад «лацінскі ўплыў» трапіла не толькі праваслаўе Малой і Белай Русі, але і сістэма духоўнай і свецкай адукацыі. Шкалярства, прыўнесенае з Захаду, лічыць П.Бяссонаў, не мела ніякай сувязі з народнай традыцыяй. «Вучоныя, літаратары, магістры, шкаляры, адукаваная шляхта, бяздушная інтэлігенцыя, цывілізаваны клас... гэта своеасаблівае саслоўе, цалкам невытворнае, бяздзейснае ў духоўнай сферы, яно вынішчала лепшыя сілы народа»[11].

Дзейнасць Мялеція Сматрыцкага, беларускага і ўкраінскага рэлігійнага дзеяча XVI—XVII стст., выклікае ў П.Бяссонава непрыняцце і асуджэнне. М.Сматрыцкі — пісьменнік-палеміст, апантаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абаронца праваслаўя — у 1627 г. прыняў уніяцтва і акрэсліў сваю канцэпцыю стварэння беларуска-ўкраінскага патрыярхату. «У змаганні, выкліканым уніяй, вера і ўсведамленне прыналежнасці да пэўнай Царквы да таго пацярпелі ад штодзённай барацьбы, якая вялася сродкамі адукацыі і навукі, што бакі часта абвінавачвалі адзін аднога ў адступніцтве і апраўдваліся, даказвалі трываласць сваіх перакананняў разважаннямі ў друку — такая, напрыклад, ганебна вядомая справа Сматрыцкага»[12].

Прозвішчы публіцыстаў эпохі Рэфармацыі і Контррэфармацыі, дзеячаў гісторыі і культуры аўтар дае звычайна без ініцыялаў, а назвы ўстаноў ці грамадскіх інстытутаў прыводзіць няцалкам. У некаторых выпадках вызначыць, пра што ідзе размова, можна толькі з кантэксту. Напрыклад, ён адзначае: «У сценах Акадэміі і яе школ багаслоўскія пытанні трактаваліся ў форме тагачаснай, занесенай да нас схаластыкі, дзеячы родам з беларускага краю, такія, як Полацкі, Белабоцкі, Мядзведзеў, процідзейнічалі лацінскаму ўплыву»[13].

Пад назвай "Акадэмія" П.Бяссонаў мае на ўвазе Маскоўскую духоўную акадэмію. Аўтар згадвае і дзеячаў, якія мелі дачыненне да стварэння акадэміі, у прыватнасці, знакамітага асветніка і паэта XVII ст. Сімяона Полацкага, які ў 1664 г. пасяліўся ў Маскве пры двары цара Аляксея Міхайлавіча і быў кіраўніком асветніцкай і кнігадрукарскай справы[14]. С.Полацкі працаваў над праектам стварэння Маскоўскай славяна-грэка-лацінскай акадэміі (пазней — Маскоўская духоўная акадэмія). Справу яго працягваў Сямён Мядзведзеў (у манастве — Сільвестр), таксама паэт і пісьменнік XVII ст., які ўзначаліў галоўную духоўную школу. Пры ім працягвалася стварэнне праваслаўнай духоўнай асветы па ўзорах заходнееўрапейскіх краін. «Узбудзіўшы некаторымі сваімі багаслоўскімі тэорыямі падазрэнні патрыярха Іаакіма, Сільвестр быў арыштаваны, катаваны і вырачаны да смерці»[15]. Андрэй Ян Белабоцкі, філасаф і паэт XVII—XVIII стст., кальвініцкі прапаведнік у Слуцку і Магілёве, у 1681 г. пераехаў у Маскву і прыняў праваслаўе. У 1680—1690-я гг. Андрэй Ян Белабоцкі напісаў шэраг філасофска-багаслоўскіх трактатаў.

Асветнікі, багасловы і літаратары XVII-XVIII стст. С.Полацкі, С.Мядзведзеў і А.Белабоцкі паходзілі з Паўночна-Заходняга краю, аднак іх дзейнасць у Маскоўіі адназначна нельга назваць «процістаяннем лацінскаму ўплыву». Яны, наадварот, арыентаваліся на заходнееўрапейскія культурныя традыцыі, прадстаўлялі еўрапейскую навуку, з'яўляліся «заходнеросамі» ў Маскоўіі.

«Пытанні веры» для П.Бяссонава як для славянафіла і заходнероса з'яўляліся прыярытэтнымі. «Праваслаўе Малой і Белай Русі, — пісаў ён, — звязанае з усімі аспектамі маралі грамадства, з літаратурнай мовай, доўга змагалася з Каталіцтвам і Лацінствам, якое ішло з Захаду праз Польшчу, у многім асімілявалася з ворагам, развілося ў вельмі своеасаблівую фармацыю брацтваў, школ, дзеячаў, пісьменнікаў і сачыненняў, напаўзаходніх і напаўусходніх, напаўлацінскіх ці напаўпольскіх і напаўрускіх»[16]. Аўтар меў на ўвазе пратэстанцкія (кальвінісцкія і арыянскія) школы ў Беларусі XVII—XVIII стст., якія выдавалі палемічную літаратуру, кнігі богаслужэбнага зместу. Такім чынам, праваслаўе на беларускіх і ўкраінскіх землях, згодна словам аўтара, падпала пад лацінскі ўплыў і далёка адхілілася ад «чыстай крыніцы» — праваслаўя дарэформеннай Русі.

Канцэпцыя гісторыі Беларусі, акрэсленая П.Бяссонавым, не была ні паслядоўнай, ні вычарпальнай. Яна з'явілася сведчаннем прыхільнасці аўтара "Гісторыі беларускага краю" да славянафільскай тэорыі і адлюстравала яго рамантычнае стаўленне да праславянскай мінуўшчыны і архаічнай народнай культуры. П.Бяссонаў адзначаў прыватныя гістарычныя і культурныя сувязі беларускіх зямель з усходнеславянскім рэгіёнам, традыцыйнай зонай візантыйскага ўплыву і на падставе гэтага абгрунтоўваў атаясамленне беларускасці з праваслаўем. Змену канфесіянальных і культурна-цэнасных арыенціраў на заходнееўрапейскія ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у Вялікае княства Літоўскае і Рэч Паспалітую ён звязваў з крызісам старажытнарускіх традыцый і, адпаведна, заняпадам самабытнай беларускай народнай культуры.

Нарыс П.Бяссонава «Гісторыя беларускага краю» напісаны ў духу заходнерусізму, грамадска-палітычнай і навуковай плыні, вывучэнне якой і на сённяшні дзень надзвычай актуальнае. «Ён (заходнерусізм. — **А.Г.**) складае адмоўны бок агульнага працэсу гісторыі культуры на Беларусі, творыць адзін з яе элементаў і ў гэтым сэнсе дае нам шмат чаго для разуменьня беларускага мінулага»[17].

---

[1] Дементьев А. Г. Очерки по истории русской журналистики 1840—50 гг. М.-Л., 1951. С. 353.
[2] Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Мн., 1993.
[3] Безсоновъ П. А. Исторія белорусскаго края, ея потребность и возможность. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. Мікрафільм. Фр. 116. С. 25.
[4] Там жа. С. 33.
[5] Там жа. С. 22.
[6] Там жа. С. 34.
[7] Там жа. С. 2.
[8] Там жа. С. 34.
[9] Там жа. С. 3.
[10] Яскевіч А. Падзвіжнікі і іх святыні: Духоўная культура старажытнай Беларусі. Мн., 2001. С. 222.
[11] Безсоновъ П. А. Исторія белорусскаго края, ея потребность и возможность. С. 31.
[12] Там жа. С. 35.
[13] Там жа. С. 34.
[14] Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992. С. 141.
[15] Большая энциклопедія. Словарь общедоступныхъ сведений по всемъ отраслямъ знаний. В 22 т. Т. XVII. СПб., 1904. С. 370.
[16] Безсоновъ П. А. Исторія белорусскаго края, ея потребность и возможность. С. 2.
[17] Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. С. 16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ